**Упраўленне адукацыі Баранавіцкага гарвыканкама**
**ДУА «Цэнтр турызму і краязнаўства дэяцей і моладзі»**

# “БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЕ ВЁСКА РУСІНО”

**У рамках конкурса на лепшы праект краязнаўчага маршрута пахода “Мой край”**

**Работу выканаў вучань гуртка**
**“Юныя турысты” ЦТКДМ**
**Жынгероўскі Яўгеній (9 гадоў)**
**дам. адрас:**
**пас. Усходні д. 4 а кв.12**
**Кіраўнік: Весялова Л.В.**

**2007 г**

**ЗМЕСТ**

**УВОДЗІНЫ…………………………………………………………………3**

**РАЗДЗЕЛ 1 КАРОТКІЯ ЗВЕСТКІ АБ РАЁНЕ ПАХОДУ**

**1.1 Карта-схема маршрута пахода............................................................4**

**1.2 Агульная фізіка-геаграфічная характэрыстыка ……………………5**

**1.3 Кароткае апісанне турысцка-краязнаўчых магчымасцей раёна…6**

**РАЗДЗЕЛ 2 ВАНДРОЎКА Ў МІНУЛАЕ**

**2.1 Ад невялікай вёскі да аграгарадка.....................................................7**

**2.2 Дом, дзе жывуць рэчы, якія гавораць и яго гаспадар……………19**

**РАЗДЗЕЛ 3 "СПЛЯЦІ" СВАЁ ЖЫЦЦЁ САМ ( у творчай майстэрні)**

**..............................................................................................................26**

**ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………………29**

**СПІС ЛІТАРАТУРЫ……………………………………………….....30**

**ДАДАТАК.............................................................................................31**

# УВОДЗІНЫ

Я хаджу закаханы у твае краявіды,
Я шапчу як прызнанне: о мой край дарагі!
Н.Гілевіч

Культурная спадчына, якая з’яўляецца нашым нацыянальным багаццем, прадметам законнага гонару нашага народа, дайшла да нас, дзякуючы шырока разгорнутай сёння рабоце па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Як знаць, можа яшчэ трохі і мы маглі б назаўсёды згубіць Мірскі замак, Нясвіжскі, Лідскі, як згубілі Гальшаны і палац у Ружанах. Азірніцеся вакол. Прыходзіць ў заняпад сядзіба у в. Ястрамбель, палац ў Грушаўцы, Савейках і інш. І такіх помнікаў гісторыі і культуры шмат.

Кажуць, што народ, які не ведае свайго мінулага, ніколі не пабудуе будучага. Таму наша задача звярнуць увагу грамадства на тое, што засталося нам ад продкаў і дапамагчы зберагчы яго. А пачынаць можна з малога, з таго, што побач.

Вось мы і вырашылі прапанаваць вам цікавы, на наш погляд, маршрут паходу ў вёску Русіно. Назвалі мы свой праект незвычайна – “ Браму скарбаў сваіх адчыняе вёска Русіно”. А чаму такая назва, стане зразумелым тады, калі вы пазнаёміцеся з нашым праектам.

Мэты: Выхаванне патрыятызму і грамадзянскай адказнасці за будучае гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю.

Папулярызацыя рэгіянальных помнікаў гісторыі і культуры Баранавіцкага раёна сродкамі краязнаўства і турызму.

Задачы: Вывучыць турысцка-краязнаўчыя магчымасці раёна пахода, пазнаёміцца з помнікамі гісторыі і культуры на маршруце, пазнаёміцца з музеем птушкафабрыкі і экспазіцыяй Цэнтра рамёстваў, сустрэцца з цікавымі людзьмі вёскі Русіно.

## КАРТА-СХЕМА МАРШРУТА ПАХОДУ

Маштаб 1 : 100 000

Умоўныя знакі:

- напрамак руху на маршруце
- касцел
- брацкая магіла
- помнікі архітэктуры

# РАЗДЗЕЛ 1 КАРОТКІЯ ЗВЕСТКІ АБ РАЁНЕ ПАХОДУ

## 1.1 Агульная фізіка-геаграфічная характэрыстыка

Маршрут паходу праходзіць па паўднёва-усходняй частцы Баранавічскага раёна Бресцкай области.

Ландшафт гэтага участка плоска-раўнінны, складзены водна-ледніковымі пяскамі, супесямі і суглінкамі. Рэльеф плоска-хвалісты, абсалютныя вышыні знаходзяцца у межах 160-170 м. Раён в. Русіно характарызуецца адсутнасцю вадоёмаў, толькі на поўдні вескі размешчана сетка меліярацыйных каналаў.

Климат тэрыторыі умерана-кантынентальны. Пераважаюць заходнія паветраныя масы. Сярэдняя тэмпература ліпеня – (+18 С), студзеня – (- 6,1 С). Колькасць ападкаў, якія выпадаюць за год, у сярэднім складае 600-630 мм. Вегетацыйны перыяд складае 193-196 дзён.

Глебы дзярнова-падзолістыя, у нізінах пераходзяць у тарфяна-балотныя. Кліматычныя і прыродныя умовы спрыяльныя для вырошчвання збожжавых и садова-агародных культур.

Уздоўж дарогі, якае вядзе да в. Русино, участак змешанага лесу з вялікай прымессю пустазелля ў падлеску. Прычына гэтай з’явы у моцным уздзеянні чалавека на навакольнае асяроддзе. У навакольных лясах в. Русіно растуць елка, сасна, бяроза, асина.

## 1.2 Кароткае апісане турысцка-краязнаўчых магчымасцей раёна

Абраны намі раён паходу цікавы і пазнавальны. На маршруце можна пазнаёміцца з экспазіцыяй музея гісторыі птушкафабрыкі, наведаць літаратурна-краязнаўчы музей в. Русіно, а таксама шэраг краязнаўчых аб’ектаў: помнікаў гісторыі і культуры.

У пасёлку вы можаце сустрэцца з цудоўнымі людзьмі: дырэктарам Цэнтра рамёстваў Бернатам М.Я, краязнаўцай Анціховіч Л.Р., майстрам лозапляцення Верамейчик Р.Г.

У Русино ёсць магчымасць набыць неабходныя прадукты харчавання ў 2-х спецыялізаваных магазінах ці паабедаць ў кафэ. Пры неабходнасці вам акажуць медыцынскую дапамогу ў мясцовым ФАПе.

Аграгарадок Русіно і г.Барановичи злучаюць 2 транспартныя артэрыі: чыгуначная ветка Баранавічы-Лунінец і аўтамабільная дарога, что вельмі зручна для мясцовых жыхароў і падарожнікаў, якія могуць таксама выкарыстаць паслугі маршрутнага таксі (интэрвал руху – 1 гадзіна).

Падарожжа па гэтым маршруце прынясе вам сапраўднае задавальненне.

# РАЗДЗЕЛ 2 ВАНДРОЎКА Ў МІНУЛАЕ

## 2.1 Ад невялікай вёскі да аграгарадка

Шмат прыгожых мясцін на зямлі беларускай,
Яны сэрца маё пакарылі навек...

І.Случанін

Першае упамінанне аб вёсцы ў пісьмовых крыніцах датуецца 18 стагоддзем.

Назва вёскі звязана з этнічным паходжаннем яе жыхароў. Русіны – азначае рускія людзі. Такую назву насіла вёска да 50-х гадоў прошлага стагоддзя. Аднак, з цягам часу паступова прыжылося новае, больш зручнае – Русіно.

А некаторыя звесткі пра мінулае вёскі нам паведамілі мясцовыя жыхары.

19 ліпеня (1 жніўня па н. ст.) 1914 г. пачалася 1-я сусветная вайна. З 18 ліпеня беларускія губерніі былі аб’яўлены на ваенным становішчы. Беларусь стала і прыфрантавой і франтавой зонай. У сувязі з наступленнем немцаў і пад напорам і прымусам вайскавых эвакуатараў на ўсход хлынулі бежанцы. На тэрыторыі в. Русіны праходзіла лінія абароны і ў гады 1-й сусветнай вайны вёска была зруйнавана. Цяжка было тым, хто вярнуўся з бежанцаў, цяжка было ўсім, хто жыў з зямлі.

З успамінаў Якімчыка Станіслава Міхайлавіча “...Калі прыехалі мы з бежанцаў, то ад вёскі толькі тры хаты засталіся, а далей адны коміны ад хат стаялі..., акопы і загародкі з дроту кругом, на выганах і палях рос бур’ян. Ад вайны ў лесе засталіся акопы і баракі, у іх і жылі. Не было ні хлеба, ні бульбы. Галадалі, варылі крапіву і лебяду. Хадзілі голыя і босыя, жабраваць прыйшлося.... Потым сталі будавацца. Цяжка было, але мы маладыя, весела жылі, дружна, вечарамі спявалі. Жыццё ў вёсцы наладжвалася...”

Як напамін аб тых часах засталіся бліндажы, якія цягнуцца ўздоўж чыгуначнай дарогі.

З 1921 па 1939 г. вёска, у складзе Заходняй Беларусіі, знаходзілася пад Польшчай. Размаўлялі жыхары на польскай мове, беларуская ж была забаронена.

З успамінаў Хіўрэнка Вольгі Антонаўны "... Жыццё было цяжкім у тыя часы. Я з другімі дзяўчатамі працавала на палях у пана. Панскі двор быў каля Баранавіч (сёння – гэта тэрыторыя ваеннага аэрадрома). Мы і жалі і палолі як дарослыя. Але пані плаціла нам крыху болей, чым дарослым, бо мы былі яшчэ падлеткамі..."

У часы Вялікай Айчыннай вайны вёска была акупіравана немцамі. У гады акупацыі ў вясковай школе працаваў выкладчыкам матэматыкі і фізікі вядомы ў раёне падпольшчык Канстанцін Пятровіч Бадак. З ліпеня 1943 года ён кіраваў работай падпольшчыкаў лакаматыўнага дэпо, за што быў арэштаваны і павешаны немцамі 26.04.1944 г. Сёння ў вёсцы, а таксама ў г. Баранавічы, ёсць вуліца, якая носіць яго імя.

У вёсцы Русіно устаноўлены помнік-абеліск на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў час вызвалення вёскі ад фашысцкіх захопнікаў і землякоў, загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну (фота № 9).

Жыхары вёскі займаліся ў асноўным сельскай гаспадаркай. У 1950 г. пачалі утвараць калгасы. З успамінаў Пятроўскай Б.В. "... У ліку першых 12 чалавек мы з мужам уступілі ў калгас. У нашым гумне зрабілі стайню. Я выконвала абавязкі вартаўніка, конюха, фуражыра... Да калектыўнай працы людзі, трэба сказаць, не цягнуліся. Як плацілі, так і працавалі. За цэлы год зарабілі па 20 кілаграмаў жыта. Але жыццё працягвалася і трэба было неяк выжываць..."

У 1957 годзе ў выніку зліцця трох калгасаў: "Пераможца", імя Суворава і імя Чкалава атрымаўся адзін, у які ўваходзілі і русіноўскія землі. На сельскім сходзе моладзь вырашыла, што новы калгас будзе насіць імя

Суворава. Потым у 1960 годзе калгас імя Суворава быў рэарганізаваны ў саўгас “Красное знамя”.

1969 год адкрывае новую старонку ў гісторыі вёскі. Пачалося будаўніцтва птушкафабрыкі. Кіраваў будаўніцтвам першы дырэктар Палонскі Іван Канстанцінавіч. Патрэбны былі новыя працоўныя рукі, а працаўнікам фабрыкі патрэбна было жыллё. Расла фабрыка, расла з ёй і вёска. Спачатку пабудавалі 2 пяціпавярховыя дамы на 60 кватэр, потым некалькі трохпавярховых і катэтджы. Работы было шмат, умовы для жыцця таксама былі, і людзі ехалі з усіх рэспублік былога СССР. Ужо ў 1971 годзе адбылося адкрыццё фабрыкі, а ў 1973 годзе яна стала працаваць на поўную магутнасць (фота № 1). Так невялікая вёска ператварылася ў вялікі пасёлак.

Сёння гэты вытворчы аб’ект – адкрытае акцыянернае аб’яднанне “БАРАНАВІЦКАЯ ПТУШКАФАБРЫКА” (фота № 2). Работнікамі фабрыкі з’яўляецца амаль тысяча чалавек, большасць з якіх працуе тут звыш 20 гадоў.

Асартымент прадукцыі фабрыкі даволі шырокі: яйкі, курынае мяса, каўбасы, маянэз, катлеты, пельмені, яечны парашок (фота № 3). Прадукцыя гэта рэалізуецца сеткай спецыялізаваных магазінаў амаль што ва ўсіх рэгіёнах Рэспублікі Беларусь, а таксама ў Расіі (фота № 5). Адзін з такіх магазінаў знаходзіцца і ў вёсцы Русіно (фота № 14). Палова прадукцыі ідзе на экспарт ( фота № 6).

На тэрыторыі гэтага вытворчага аб’екта ёсць музей гісторыі фабрыкі. Музеем кіруе старшыня прафсаюза Эдуард Баляслававіч Сідарэня (тэл. 44-87-08). Створаны музей, дзякуючы цудоўнай жанчыне Анціховіч Людміле Рыгораўне (фота № 10). Нарадзілася яна пад Беластокам, а ў Русіно жыве с 1947 года. Некаторы час яна працавала выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў в. Стайкі, потым завучам у Паланечцы, а с 1967 г. і да пенсіі – дырэктарам Русіноўскай школы.

Дзякуючы яе намаганням і ініцыятыве ў вёсцы з’явілася трохпавярховая школа, дзе ёсць ўсе ўмовы для заняткаў.

Людміла Рыгораўна яшчэ  і выдатны краязнаўца. Яшчэ будучы настаунікам, яна стварыла музей гісторыі школы, апісала гісторыю гандлю і пошты  ў вёсцы, а таксма чыгуначнай станцыі.  Гэта няўрымслівая  жанчына і на пенсіі не здае сваіх пазіцый. Сёння яна – стараста вёскі, а гэта вельмі адказная пасада.

Мы спадзяёмся, што яшчэ не аднойчы завітаем да яе і даведаемся шмат цікавага пра вёску і яе жыхароў.

Трэба сказать, што сёння Русіно – гэта аграгарадок, у якім 13 вуліц. Сярод іх  Сонечная, Лугавая, Школьная і іншыя. А некалі іх было толькі дзве. Адна з іх была заўседы ў вадзе, масцілі яе бярвеннем і пяском, але праехаць па ёй было ўсё роўна цяжка. Сёння гэта вуліца асфальтаваная і носіць імя Суворава. А другая пачыналася так. Кожны салдат, які вяртаўся з вайны, атрымліваў надзел зямлі, які ў той час меў назву «куна». Колькасць надзелаў паступова  расла, расла і  яшчэ адна вуліца. Потым   яна так і стала называцца Куніцкай (ад “куна”). Вось з гэтых 2-х вуліц, імя Суворава і Куніцкай і складалася ўся вёска.

Сёння ў пасёлку ёсць сярэдняя школа (фота № 11), дзіцячы садок, бібліятэка, філіял “Беларусбанка”, паштовае адзяленне (фота № 12), чыгуначная  станция, лазня, камбінат бытавога абслугоўвання (фота № 16), ФАП,  2  спецыялізаваных магазіна і кафэ (фота №  13).

В 1994 году ў Русіно  за кошт ахвяраванняў мясцовых католікаў быў пабудаваны касцёл Хрыста Цара Сусвету ( фота № 15). Будаўніцтва пачалося яшчэ з 1993 года і самі жыхары вёскі удзельнічалі ў ім. У касцёле існуе нядзельная школа для малодшых, дзе заняткі вядзе сястра Тамара, і для старэйшых дзяцей, дзе выкладае ксенз  Конрад Патыка.

Нажаль у Русіно няма праваслаўнай царквы, што вельмі незручна  для насельніцтва. Таму мясцовыя праваслаўныя жыхары пачалі збіраць сродкі на будаўніцтва праваслаўнага  храма.  Яны спадзяюцца, што іх мара здзейсніцца.

Фота №1

Фота № 2

Фота № 3

Фота № 4

Фота № 5

Фота № 6

Фота № 7

Фота № 8

Фота № 9 На брацкай магіле

Фота № 10 Анціховіч Л.Р.  на адкрыцці помніка

Фота № 11  Сярэдняя школа

Фота № 12  Пошта

Фота №  13 Магазін і кафэ

Фота № 14 Спецыялізаваны магазін  птушкафабрыкі

Фота № 15 Касцёл

Хрыста Цара Сусвету

Фота № 16 Камбінат  бытавога абслугоўвання

## 2.2 Дом, дзе жывуць рэчы, якія гаворацць і яго гаспадар

О, Беларусь! Мяне ты ўзрасціла,
Дала мне мову, песню, зрок і слых,
Каб імі надзяліў дзяцей сваіх.
А.Грачанікаў

Назва гэтага раздзела “Дом, дзе жывуць рэчы, якія гавораць” не выпадковая. Мы завіталі ў ЛІТАРАТУРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ вёскі Русіно. Тут сапраўды жывуць рэчы, якія могуць расказаць пра многае. Кожны экспанат – гэта гісторыя. Але самае цікавае тут – гэта гаспадар – кіраўнік музея Бернат Міхась Язэпавіч, ці спадар Міхась, як ён нам сказаў. Сапраўды гэта незвычайны чалавек. Ён, па сутнасці і стварыў гэты музей. Усе гэтыя гады, ён вышуквае па вёскам рэчы даўніны далёкай і не вельмі. Зусім нядаўна знайшоў жорны і самаробную даваенную медагонку з хутара Чаромушнік, гаспадара-майстра якога ўжо няма ў жывых.

Папершае, экспазіцыя музея знаходзіцца ў будынку былой школы, які сам па сабе з’яўляецца помнікам архітэктуры драўлянага дойлідства (фота № 17). Пабудаваны ён за кошт ахвяраванняў удавы пана Пілсудскага ў прошлым стагоддзі. Усяго ў вобласці было 5 такіх будынкаў. Да сёняшняга часу захавалася толькі два: у Юшкавічах і Русіно.

Да 80-х гадоў у гэтым будынку знаходзілася школа, у якой вучыўся і Міхась Язэпавіч

І вось мы ў літаратурна-гістарычнай зале і гісторыя Баранавіцкага раёну ажывае на нашых вачах. Перад намі кампазіцыі “Гарадзішча з селішчам” і “Мышскі замак Хадкевічаў”. Далей экспазіцыя першай залы распавядае пра ўтварэнне ВКЛ, пра сусветна вядомы род Радзівілаў і знаёміць нас з нашымі знакамітымі землякамі А.Рымшай, А.Міцкевічам, Я.Чачотам і іншымі. У наступных залах ( усяго іх пяць) этнаграфіі, ганчарства і краязнаўства прадстаўлены: апрацоўка ільну, ганчарства

Фота №17 Будынак літаратурна-этнаграфічнага музея

Фота № 18

У зале ганчарства

Фота № 19 Прыстасаванні для бортніцтва

Фота № 20 Жорны

(фота № 18), бандарства , пляценне з лазы і лыка, бортніцтва (фота № 19), даўбежнае рамяство. У зале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва прадстаўлены творы мастакоў і таленавітых людзей нашага раёна, а таксама калекцыя карцін “Страчаная спадчына”. Цікавая гісторыя гэтых карцін, якую нам паведаміў Міхась Язэпавіч. Каля шасці гадоў таму ён выступаў з дакладам на сімпозіуме ў Польшчы і у Кракаўскім музеі-бібліятэцы сфатаграфаваў дзесяць карцін вядомых мастакоў (сярод іх і карціны Напалеона Орды), прысвечаных баранавіцкім відам. Шмат з таго, што паўтара стагоддзя таму было адлюстравана пэнзлем мастакоў, ужо няма. Таму М.Бернат папрасіў сучаснага баранавіцкага мастака Дзмітрыя Шчаснага па фотаздымках зрабіць копіі тых карцін. Вось так і з’явілася гэтая калекцыя.

Яшчэ адзін цікавы экспанат – гэта макет сядзібы ў весцы Ястрамбель. Каб зрабіць яго, навучэнцы Брэсцкага палітэхнікума (выкладчык В.А.Тарыма) выпісвалі чарцяжы з самой Варшавы. Шкада, што сядзіба гэта прыходзіць ў заняпад. Некаторы час ў ёй знаходзіўся інтэрнат для дзяцей сірот, а калі пабудавалі новы будынак, маёнтак пакінулі на выміранне.

У 2003 годзе літаратурна-этнаграфічны музей быў рэарганізаваны ў БАРАНАВІЦКІ РАЁННЫ ЦЭНТР РАМЁСТВАЎ (гл. дадатак), таму на яго тэрыторыі можна пабачыць таксама прыгожую драўляную альтанку, дзеючую кузню, калодзежны журавель і калаўрот (фота № 23, фота № 24 ).

Гордасць музея – стоўбчаты ветраны млын (помнік архітэктуры XIX стагоддзя). Ён галоўны і самы высотны аб’ект на 2,5 гектарах тэрыторыі музея ( фота № 21 ).

Зусім нядаўна на яго месцы стаяў другі млын, але ён быў пашкоджаны пажарам і некаторы час рэшткі папялішча быццам папракалі людзей у раўнадушшы, абыякавасці і бяздзейнасці. Але Міхася Язэпавіча Берната, не назавеш раўнадушным, таму што ён у 2004 годзе пасля доўгіх пошукаў знайшоў падобны стары млын у вёсцы Залюбічы Ляхавіцкага раёна, сваімі рукамі разабраў, перавез у Русіно і ўстанавіў за кошт асабістых сродкаў.

Фота № 21 Млын

Фота № 22  Бернат М.Я.  у самым сэрцы  млына

Фота № 23

Калаўрот

Фота № 24

Калодезны журавель

За працэсам разборкі застала яго мясцовая бабуля і стала папракаць**,** быццам гэта быў млын яе бацькі, рэквізаванны калгасам:

- Хто ты такі, што на дровы яго пускаць уздумаў?

Міхась Язэпавіч супакоіў “спадчынніцу”:

- Млын людзям застанецца, у музеі стаяць будзе, каб нашчадкі змаглі адчуць дух даўніны.

Гэтае збудаванне адносіцца да пачатку 20 ст. А пабудавалі млын браты Іван і Канстанцін Рэшкі за кошт асабістых сродкаў. Да 1960 г. млын даваў па 300 пудоў мукі ў дзень і забяспечваў гэтым неабходным прадуктам усе навакольныя вёскі.

Млыны такога тыпу будавалі паблізу дарог, каб было зручней дабірацца. Практычна ўвесь ён зроблены з дрэва і канструкцыя яго вельмі складаная: налічвае 700 вузлоў і дэталяў. У цяперашні час млын стаіць на цэментнай падушцы, а аснова канструкцыі – стоўб каля метра у дыяметры – зроблены з дуба і прастаіць яшчэ шмат гадоў. Хуткасць руху млына рэгулюецца пры дапамозе спецыяльнай тармазной сістэмы.

Міхась Язэпавіч родам з гэтых месц і можа быць таму яму не абыякавы лёс храма памяці , як ён называе створаны па прызванні уласнага сэрца цэнтр рамёстваў.

Шкада, што будынак, дзе знаходзіцца экспазіцыя музея, таксама пад пагрозай і патрабуе рамонту – драўляны будынак пашкоджаны грыбком. Вось такія справы. Канечне, патрэбна шмат сродкаў каб зберагчы гэтыя сапраўдныя скарбы беларусаў для нашчадкаў. Але мы спадзяёмся, што той, хто завітае сюды не застанецца раўнадушным, адгукнецца і дапаможа.

Супрацоўнікі музея шчыра запрашаюць усіх жадаючых наведаць музей, а Міхась Язэпавіч нават быў згодны правесці экскурсію ў нядзелю, калі музей не працуе, за што яму вялікі дзякуй. Вось такія дабразычлівыя тут людзі.

А нас чакае наступная сустрэча.

## РАЗДЗЕЛ 3 “СПЛЯЦІ” СВАЁ ЖЫЦЦЁ САМ (у творчай майстэрні)

Не бывае творцы без натхнення. Яму, часам капрызнаму і няўлоўнаму падпарадкаваны думкі і духоўныя памкненні музыкантаў, паэтаў, мастакоў. І толькі яно акрыляе, узнімае чалавека над будзённасцю, напаўняе творчасць сэнсам.

І.Матусевіч

Усе ведаюць, што самыя вялікія фантазеры – дзеці. З узростам большасць людзей страчваюць гэту здольнасць – заўважаць цуды навакольнага свету, а бачаць толькі будзёную рэальнасць. Напэўна, той, каго фантазія не пакідае і ў дарослым узросце, становіцца сапраўдным творцам.

Жыве ў вёсцы Русіно жанчына, апантаная духам творчасці. І нас чакае цікавая сустрэча с сапраўдным творцам, сапраудным майстрам – Раісай Генадзеўнай Верамейчык.

Нарадзілася яна ў 1949 годзе на хутары Язвін, каля Русіно. Скончыла 10 класаў і паступіла ў Віцебскае кулінарнае вучылішча. Пасля яго заканчэння працавала поварам у рэстаране “Усход” г. Баранавічы, потым некаторы час – на птушкафабрыцы, а з 1992 года перайшла ў Русіноўскую школу, дзе кіравала гуртком прыкладнога мастацтва.

Быць майстрам дадзена не кожнаму. Усе творчыя людзі сыходзяцца на думцы, што каб стаць майстрам, трэба мець як мінімум жаданне і настойлівасць.

Напэўна, менавіта гэтыя якасці дапамаглі Раісе Генадзеўне самастойна авалодаць адным з традыцыйных народных промыслаў – лозапляценнем.

Фота № 25 Верамейчык Р.Г. са сваімі вырабамі

Да ўсяго гэтая жанчына даходзіла сама, таму што спецыяльнай літаратуры амаль што не было. З цягам часу напрацавала свае методыкі і тэхналогіі апрацоўкі розных матэрыялаў, а таксама ўзоры вырабаў з іх. І сёння адзін з пакояў у яе доме ператвораны ў выставачную залу. Колькі цудоўных вырабаў мы тут пабачылі! Пано, вазы, лялькі, кошыкі, жывёлы... (фота № 25). І гэта ўсё зроблена яе рукамі не толькі з лазы, але і з шышак, чароту, саломы, жалудоў, насення і шмат чаго іншага.

Канечне, нас зацікавіў працэс нарыхтоўкі лазы. Спачатку Раіса Генадзеўна шукае патрэбную лазу. Потым яе трэба зрэзаць, выварыць, высушыць, перад пляценнем замачыць. Вось якія працаёмкія этапы. А пасля – самы час даць волю фантазіі. Галоўнае, нічога не баяцца, не баяцца марыць, шукаць у творчасці штосьці сваё, адметнае. Майстар працуе над творам, каб зрабіць прыемнае людзям, здзівіць іх. Канечне, пачынаць трэба с самага простага: кошыкаў, карзін, падносаў. Наогул, магчымасці лазы бязмежныя.

Сёння Раіса Генадзеўна – пенсіянерка, і акрамя заняткаў любімай справай шчодра дзяліцца сакрэтамі майстэрства з усімі, хто жадае навучыцца плесці з лазы і практычныя рэчы, і дэкаратыўныя вырабы. Хаця спачатку рэакцыя аднавяскоўцаў была неадназначнай: калі людзі бачылі жанчыну з бярэмем лазовых дубцоў у руках, то лічылі яе дзівачкай. А вось калі пабачылі гатовыя вырабы, то гэта выклікала толькі захапленне.

Работы Раісы Генадзеўны неаднаразова экспанаваліся на выставах у Баранавічах, Брэсце, Мінску, заўсёды выклікалі самую жывую цікаўнасць у гледачоў і атрымлівалі ўзнагароды (гл. дадатак). Вялікая мара гэтай жанчыны-творцы – выдаць кнігу, дзе яна зможа падзяліцца сакрэтамі сваёй творчасці.

Тварыць, фантазіраваць, марыць можна ў любым узросце. Галоўнае, як лічыць Раіса Генадзеўна, – не баяцца цяжкасцей і перашкод, не сядзець на адным месцы, а ўвесь час развівацца, любіць свет і жыццё.

**ВЫНІК**

Вось і скончылася наша падарожжа.

Прапанаваны намі маршрут вельмі цікавы. Пачынаць яго мы параім вам са знаёмства з птушкафабрыкай. З музеем гісторыі якой вас пазнаёміць Сідарэня Эдуард Баліслававіч, альбо Анціхові Людміла Рыгораўна. Дзякуючы ёй і быў створаны гэты музей.

Далей вы адкрыеце для сябе цудоўныя скарбы Цэнтра рамёстваў, якім кіруе незвычайны чалавек Міхась Язэпавіч Бернат. Пазнаёміцеся з экспанатамі літаратурна-этнаграфічнага музея і пабачыце дзеючую кузню і млын, якія цудам дайшлі да нашых дзён.

У вёсцы вы таксама сустрэнецеся з сапраўдным майстрам лозапляцення Верамейчык Раісай Генадзьеўнай і пабачыце яе цудоўныя вырабы.

Пабыўшы ў Русіно, мы зрабілі вынік, што хоць вёска і не знакаміта якімі-небудзь гістарычнымі падзеямі, але ж у ёй жывуць сапраўды цікавыя і таленавітыя людзі, якімі яна і ганарыцца.

## ЛІТАРАТУРА

1.Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя. Т.3, кн. 1. Брэсцкая вобласць/ рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2006. – 528 с.

2.Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка г. Баранавічы і Баранавіцкага р-на. – Мн.: БЕЛТА, 2000. – 736 с.

3.Свод памятников истории и культуры. Брестская область. Под ред. С.В.Марцева – Мн.: БСЭ, 1990. – 496 с.

**ДАДАТАК**